ями, разворачивавшими критику и всевозможные обвинения в адрес автора» (с. 207). «Академические московские годы помнятся до сих пор, периодически очень! хочется туда, в Москву, на Садово-Кудринскую, на Вернадского…» (с. 208).

После окончания академии у П. П. Украинец наступает очень плодотворный период, как она называет его, «машеровский» – работа в аппарате ЦК КПБ. Об этом времени автор пишет по-особому, с искренней любовью, много места уделяет содержанию своей работы, людям, с которыми приходилось встречаться, и, конечно, своим коллегам. На наш взгляд, получилось убедительно и интересно… По прочтении возникает реальное видение огромной и напряженной работы, которую проводил главный политический штаб республики.

Конечно, рано еще ставить точку. Мы уверены, что появится продолжение книги. Но даже то, что профессор П. П. Украинец выдала на гора, заметно, значимо и убедительно. Это стало достоверным свидетельством эпохи, исторической летописи нашей страны. Книга написана хорошим литературным языком, читается на одном дыхании.

Масштаб проделанной автором работы столь велик, а содержание книги так насыщено знанием реальной жизни, что хочется рекомендовать всем, кому небезразлична история Отчизны, судьба человека. С уверенностью можно сказать, что оторваться от книги будет просто невозможно… Жаль, что тираж просто мизерный.

***А. Н. Данилов***[1]

## «ДЫЯМЕНТЫ ПАМЯЦІ І АДКАЗНАСЦЬ ЗА БУДУЧЫНЮ»

## «DIAMONDS OF MEMORY AND RESPONSIBILITY FOR THE FUTURE»




У выдавецтве «Беларуская навука» выйшла кніжка Васіля Драгаўца «Запозненае прызнанне» з падзагалоўкам – «Біяграфічны спroot». Узнікае пытанне: гэта споведзь ці прызнанне? З кнігі відаць, што ў аутара хопіць эмоцый і матэрыялу і на тое, і на другое, калі ўлічыць, што ў першыя гады суверэнітэта Рэспублікі Беларусь ён займаў высокія дзяржаўныя пасады і належаў да той невялікай тады групы высокіх дзяржаўных службоўцаў, што не дапусцілі да дяржаўных скарбніц і маёмасці хціввых і злоўмысных. Ім сёння трэба падзякаваць за тое, што ў Беларусі не нарадзіўся алігархічна-крымінальна-бюракратычны капіталізм, які сёння смокча сокі з многіх другіх краін постсавецкай прасторы. Праўда, падобна на тое, што аўтар і сёння яшчэ не лічыць магчымым распавядаць пра тыя цяжкія, няўдзячныя, драматычныя часіны.

Кніга В. Драгаўца прысвечана дзяцінству і можа быць названа прызнаннем у любові да сваёй вёскі і родных мясцін, да бацькі і маці, да Радзімы – Заходняй Беларусі – якая і ў сучаснасці захоўвае сваю гістарычна-культурную адметнасць. Яна пачынаецца з выдатнай прадмовы, напісанай вядомым грамадскім дзеячам і пісьменнікам Анатолем Бутэвічам. Ён згадвае тыя нясвіжска-клецкія сцежкі, па якіх Васіль і Толік маглі хадзіць разам, еднасць душ і ўспамінаў аб незабыўных гадах дзяцінства. Хочацца ўсклікнуць: «І я, і я хадзіў там і многае бачыў і чуў, а таксама перажыў, што і гэтыя два малыя рабінзоны!»

Аўтар гэтых кароткіх нататак нарадзіўся ў вёсцы Дамашы Ляхавіцкага раёна, якая знаходзіцца на самай мяжы з Нясвіжскім раёнам. Ён памятае, як у далёкім 1944 г. з гарэлых дамоў і сядзіб ляцеў попел нават да іх вёскі. Пачынаючы з 1951 г. ён правёў чатыры шчаслівыя гады падчас вучобы

[1]*Александр Николаевич Данилов* – член-корреспондент Национальной академии наук Беларуси, доктор социологических наук, профессор; заведующий кафедрой социологии факультета философии и социальных наук Белорусского государственного университета.

*Alexander N. Danilov*, corresponding member of the National Academy of Sciences of Belarus, doctor of science (sociology), full professor; head of the department of sociology, faculty of philosophy and social science, Belarusian State University.

E-mail: *a.danilov@tut.by*

ў Нясвіжскім педагагічным вучылішчы. Канечне, гэта быў цяжкі час. Ісці дадому, а потым назад у Нясвіж часта прыходзілася пешшу. А гэта 30 кіламетраў! Часам падвозіў мяне на кані мой стрыечны брат Вячаслаў Рыгоравіч. Мы выязджалі а другой гадзіне ночы і па сноўска-нясвіжскай брукаванцы на золаку прыбывалі ў Нясвіж. Аб гэтым мы даведваліся, калі з цемры раптоўна высоўвалася адна з нямногіх уцалеўшых цагляных будынін, у якіх сёння размешчаны музей Нясвіжа. Паколькі я быў старэйшы за абодвух аўтараў, у мяне на памяці засталіся і трагічныя наступствы першых гадоў калектывізацыі (у Заходняй Беларусі масавая калектывізацыя пачалася напрыканцы 1940-х гг.).

Вёска жыла бедна. Не хапала хлеба, і сяляне гуртамі ездзілі ў гарады, выстойвалі доўгія гадзіны ў чэргах, каб прынесці дамоў пару ўжо счарствелых буханак. Падчас вандровак пешшу ў Нясвіж прыходзілася бачыць жудасныя караваны: нямоглыя галодныя калгасныя коні цягнулі на санях напаўжывых калгасных кароў – тыя з голаду ўжо не маглі стаяць на нагах, таму іх адпраўлялі на бойню. Было і многае другое, аб чым нават сёння, ужо ў вельмі сталым веку, нават цяжка гаварыць. Аднак жыццё паступова наладжвалася, і дзяцінства нашых аўтараў прыпадае на больш светлы час.

Мне вельмі сугучны матыў прымірэння і ўзаемапаразумення, якія Васіль Драгавец прапануе як лейтматыў сваіх «запозненых прызнанняў»: ёсць добрыя і злыя людзі, ёсць гожыя справы людзей, а ёсць і не вельмі. Трэба ўмець зразумець і прабачыць. Гэта вельмі няпроста, але кожны раз, калі гэта ўдаецца зрабіць, колькасць зла ў свеце паменшаецца. В. Драгавец валодае ўменнем убачыць гераічнае ў выкананні свайго доўгу перад Богам, Айчынай, сваімі блізкімі, бацькамі, дзядзькамі, суседзямі, знаёмымі, проста беларусамі. З эмацыянальнага, глыбока асабістага ўспрымання Беларусі і беларусаў у Васіля Драгаўца паўстае магутны культурна-ідэнтыфікцыйны маральны код Бацькаўшчыны. Цывілізацыя Беларусі сфарміравалася на сялянскай аснове, якая, дарэчы, уласціва ўсяму ўсходнеславянскаму абшару. Цяжкая сялянская праца разгортвалася ў залежнасці ад пары года. У гэтым – яе прамая сувязь з Космасам і выхад на яго наймацнейшую і найменей вядомую нават сёння сілу – Бога. Сцэны малітвы малога Васіля і яго бацькоў напярэдадні нараджэння Спасіцеля – найбольш моцныя ў кнізе. Такія ўспаміны ёсць у многіх суайчыннікаў, у тым ліку і мяне. На жаль, не хапае ўмення сказаць аб гэтым уражліва і кранальна. Варта, аднак, адзначыць, што вера большай часткі беларусаў – праваслаўе, і гэта яднае нас з рускім светам, асновай якога з’яўляецца праваслаўе ў яго візантыйскім, самым строгім і патрабавальным варыянце хрысціянства.

Канечне, і мне хацелася б, як і аўтару прадмовы, прайсціся з касой ці сярпом па ніве. Але, братка Анатоль, дзе сёння тыя косы ці сярпы? Сёння на нашу ніву выходзяць другія людзі з другімі сродкамі. Беларусь сялянская неяк незаўважна для нас, старэйшых, саступіла месца Беларусі гарадской, дзе і пражывае сёння большасць нашых суайчыннікаў. Але кніга Васіля Драгаўца якраз і напамінае, ненавязліва і ў стылі прыгожага аповеду, аб той мінуўшчыне, дзе многа гора, слёз і пакут. Але і тады было і шчасце любові, працы, здабыткаў. Нашы сем’і выпраўлялі сваіх дзетак у свет з любоўю і малітвай. Гэта дапамагала ім пераадолець цяжкасці, вучыла цаніць працу, вернасць, дружбу, разумець, што толькі чэснае жыццё дасць чалавеку магчымасць, азірнуўшыся назад, сказаць: «Я зрабіў усё, што мог. Хай другія зробяць лепей». – «Дзякуй табе, Васіль!»

***І. І. Антановіч***[1]

[1]*Иван Иванович Антонович* – доктор философских наук, профессор; главный научный сотрудник Института социально-политических исследований Российской академии наук.

*Ivan I. Antonovich*, doctor of science (philosophy), full professor; principal researcher at the Institute of Socio-Political Researches, Russian Academy of Sciences.
Email: *iantonovich@mail.ru*